ПРАФСАЮЗ – ГЭТА АДКРЫТЫ ДЫЯЛОГ З РАБОТНІКАМІ
Гутарка з новым старшынёй пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі работнікаў БДУ Уладзімірам СУВОРАВЫМ
Стар. 2

У ПОШУКУ СЯБЕ І НОВЫХ МАГЧЫМАСЦЯЎ
Лідар Савета маладых навукоўцаў Наталля АНЦУХ распавяла, як праводзяцца крэатыўныя заняткі са студэнтамі
Стар. 6

FABLAB – СУЧАСНАЯ МАЙСТЭРНЯ ІНАВАЦЫЙ
Якія ідэі рэалізуе праект па стварэнні сеткавай інфраструктуры для падтрымкі моладзевага прадпрымальніцтва?
Стар. 7

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»

25 верасня 2018 года, № 13 (2201)

ПАДЗЕЯ

Космас стаў бліжэй!

Фота Васіля КУЗЬМЕНКІНА

Касманаўты і астранаўты на сустрэчы з рэктарам БДУ Андрэем Каралём. Кевін Энтані Форд (ЗША), Герхард Ціле (Германія), Лусід Шэнан (ЗША), Марыа Ранка (ЗША), Арнэ Крыстэр Фуглесанг (Швецыя), Джэфры Алан Хофман (ЗША), Лорэн Уілбер Эктан (ЗША), Грэгары Олсен (ЗША), Антон Шкаплераў (Расія), Валерый Токараў (Расія)

«Мы ствараем касмічную будучыню», – прамовіў, разгарнуўшы беларускі сцяг, наш зямляк Алег Навіцкі летась з борта МКС. А ўжо сёлета гэта фраза стала галоўнай тэмай XXXI Міжнароднага кангрэса Асацыяцыі ўдзельнікаў касмічных палётаў, які прайшоў у Мінску з 9 па 15 верасня.

У падзеі планетарнага маштабу прынялі ўдзел і прадстаўнікі БДУ, у ліку якіх рэктар **Андрэй Кароль,** прарэктар па навуковай рабоце **Васіль Сафонаў,** дырэктар НДІ ПФП імя Сеўчанкі **Пётр Кучынскі,** кіраўнік аддзела аэракасмічных даследаванняў НДІ ПФП **Барыс Бяляеў,** дэкан ФРКТ **Сяргей Малы,** загадчык кафедры фізікі і аэракасмічных тэхналогій ФРКТ **Уладзімір Саечнікаў,** а таксама супрацоўнікі, якія займаюцца падрыхтоўкай першага беларускага ўніверсітэцкага нанаспадарожніка.

Працяг тэмы чытайце на стар. 4–5

Нанаспадарожнік БДУ – на старт!

ПРАЕКТ ПА СТВАРЭННІ МАЛОГА СПАДАРОЖНІКА, які пачалі рэалізоўваць у нашым універсітэце ў 2015 г., знаходзіцца на заключнай стадыі. Як паведаміў першы прарэктар БДУ акадэмік **Алег Івашкевіч** у праграме «Падзеі» тэлеканала «Беларусь 24», універсітэцкі спадарожнік ужо гатовы да запуску, праведзены ўсе выпрабаванні і падпісаны кантракт з кітайскай карпарацыяй «Вялікая сцяна», якая даставіць яго на арбіту. Запусціць спадарожнік плануюць 29 кастрычніка. «Нанаспадарожнік важыць каля 1,5 кг і мае невялікія памеры – 20х10х10 см, але функцыі у яго шмат, у тым ліку – адукацыйная. У яго стварэнні ўдзельнічалі нашы студэнты, магістранты і аспіранты. Яны будуць атрымліваць інфармацыю непасрэдна з арбіты і апрацоўваць яе», – падкрэсліў Алег Анатольевіч. Ён адзначыў, што БДУ даўно ўносіць уклад у развіццё касмічнай галіны. У прыватнасці, беларускія навукоўцы распрацавалі спецыяльны клей, у якога дагэтуль няма аналагаў. Ён працуе ў інтэрвале тэмператур ад -60°С да 1500°С і ўжываўся для мацавання цеплаізаляцыйных пласцін да корпуса касмаплана «Энергія-Буран». Таксама БДУ супрацоўнічае з Раскосмасам: «На МКС ужо два гады выкарыстоўваецца распрацаваны нашымі навукоўцамі комплекс фота-, відэа- і спектральнай здымкі».

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

Прафсаюз – гэта адкрыты дыялог з работнікамі

Па выніках IX пленума Пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі работнікаў БДУ старшынёй прафкама абраны **Уладзімір СУВОРАЎ.** Уладзімір Васільевіч, які прапрацаваў шмат гадоў прарэктарам нашага ўніверсітэта, падзяліўся сваім бачаннем узаемаадносін з супрацоўнікамі і адміністрацыяй ВНУ.

Прафкам работнікаў БДУ.

Злева направа: намеснік старшыні Аляксандр Нікіценка, галоўны спецыяліст Святлана Кавалёва, галоўны бухгалтар Ніна Самойленка, старшыня Уладзімір Суворaў

Не працоўныя, а чалавечыя рэсурсы

– Я бачу перад сабой мэту спрыяць карпаратыўным, чалавечым узаемаадносінам у калектыве. Гэта павялічыць эфектыўнасць працы супрацоўнікаў і мінімізуе сацыяльнае трэнне. Бо вельмі важна, з якім настроем людзі прыходзяць на працу. Асабліва важна гэта ў перыяд структурных змен. Калектыў БДУ – гэта супольнасць у большасці сваёй інтэлігентных і высокаадукаваных людзей. Мне падаецца, што важнай місіяй прафсаюза з'яўляецца ўдзел у развіцці ўніверсітэта не столькі як схемы, а менавіта як грамадства, удзельнікі якога ўсведамляюць і паважаюць прынцыпы функцыянавання ўніверсітэта, ствараюць у калектывах мікраклімат, які дазваляе кожнаму рэалізаваць свой патэнцыял.

Важным інструментам у гэтым сэнсе выступае Калектыўная дамова, падпісаная рэктарам БДУ і старшынёй прафкама, у якой адміністрацыя прызнае прафкам (выбарны кіраўнічы орган прафсаюза БДУ, у яго ўваходзяць усе старшыні прафсаюзных бюро структурных падраздзяленняў БДУ) ***адзіным паўнамоцным прадстаўніком работнікаў*** у калектыўных перамовах. Дамова рэгламентуе амаль усе бакі выторвых адносін. Гэта і гарантыі занятасці, і арганізацыя, нармаванне і аплата працы, і рэжым працы і адпачынку, і працоўныя і сацыяльныя адпачынкі, дадатковыя льготы і гарантыі работнікам, пытанні аховы працы, палажэнне пра матэрыяльнае стымуляванне працы, палажэнне пра парадак выкарыстання фонду матэрыяльнай дапамогі і шматлікае іншае. Стаўшы пунктамі дамовы, абавязанні (як наймальніка, так і прафсаюза) становяцца абавязковымі для выканання.

Членскія ўнёскі – на канкрэтную дапамогу

– Прафсаюзная арганізацыя імкнецца да больш поўнай падтрымкі сваіх членаў. Так, напрыклад, з фонду прафсаюза толькі ў верасні 2018 г. было падтрымана каля 180 супрацоўнікаў на суму 16668 руб. Пры гэтым матдапамога па такіх падставах, як тым, хто ўпершыню зарэгістраваў шлюб (511 руб.), для падрыхтоўкі дзяцей да школы шматдзетным сем'ям, сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, і адзінокім маці (5341 руб.) аказваецца ***толькі прафсаюзнай арганізацыяй***.

Вялікае значэнне мае ўвага калектыву да кожнага канкрэтнага работніка. Так, аднаразовыя ўзнагароды да юбілейных дат членам прафсаюза склалі 2630 рублёў.

Падтрымліваем ветэранаў ВАВ. У нас ёсць пенсіянеры, якія не працуюць у БДУ, але засталіся на прафуліку. Яны не плацяць унёскаў, але ў цяжкай сітуацыі мы ім імкнёмся дапамагаць.

Прафсаюзныя ўнёскі складаюць 1 % ад зарплаты. Часам чую: «Я ў прафсаюзе 20 гадоў, і за гэта нічога не меў». Так, магчыма, яму пашанцавала. Але я асабіста не шкадую пра той працэнт, таму што ведаю, што на гэтыя грошы хтосьці з'ездзіў паправаць здароўе, камусьці зрабілі аперацыю, камусьці мы падтрымалі ў цяжкую хвіліну, а камусьці дапамаглі ў школу партфель сабраць, і гэта той мінімум, які я магу даць як удзельнік карпарацыі. Да таго ж, упэўнены, што справа тут не ў 1 %, а ў сумневе, што грошы выдаткаваны правільна, у тым ліку і з прычыны адсутнасці даступнай інфармацыі. І гэту задачу трэба вырашаць.

Важна ***павялічыць інфармаванасць*** людзей пра ўніверсітэцкія працэсы і пра дзейнасць самой прафсаюзнай арганізацыі. Важным рэсурсам з'яўляюцца камісіі, якія наймальнік і прафсаюз стварваюць на парытэтных пачатках: камісія па працоўных спрэчках, грамадская камісія па жыллёвых пытаннях, на аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні, па прызначэнні дзяржаўнай дапамогі... і інш. Па шматлікіх пытаннях гэтыя камісіі дапамагаюць зняць супярэчнасці і напружанне. Гэта цывілізаваная форма функцыянавання любога прадпрыемства.

Фонды прафсаюзаў

– Фонды прафкама фарміруюцца з членскіх унёскаў. Ёсць яшчэ разавае паступленне ў канцы года ад універсітэта – 0,15 % ад перавышэння прыбыткаў над выдаткамі. Прыкладна ***81 % работнікаў БДУ*** з'яўляюцца членамі прафсаюза. Штомесячная сума ўнёскаў, якая застаецца пасля абавязковых адлічэнняў у ЦК галіновага прафсаюза, складае каля 35 тыс. руб.

Нашы выдаткі празрыстыя. Усе яны плануюцца калегіяльна. Так толькі на культурна-масавыя і спартыўна аздараўленчыя мерапрыемствы было выдаткавана за 8 месяцаў бягучага года каля 81 тыс. руб. (наведванне тэатраў і канцэртаў, віншаванне членаў прафсаюза з юбілейнымі датамі, арганізацыя і правядзенне святочных мерапрыемстваў, падтрымка творчых калектываў «Літарынка» і «Родніца», спартакіяды, заработная плата кіраўнікам груп здараўэя, а іх у нас каля 35). На матэрыяльную дапамогу членам прафсаюза за гэты ж перыяд было выдаткавана 73 тыс. руб., каля 33 % ад гэтай сумы склалі выдаткі на патанненне для членаў прафсаюза сямейнага адпачынку ў «Брыганціне» (96 рублёў на чалавека). Акрамя гэтага матдапамога на санаторна-курортнае лячэнне склала 3880 руб.

Ахова працы

– Адна з задач прафсаюза – бяспечныя ўмовы працы. Раздзел і некалькі дадаткаў Калектыўнай дамовы прысвечаны гэтаму пытанню. Да прыкладу, дадатак 3 «Пералік працоўных месцаў па прафесіях і пасадах БДУ, на якіх работнікам па выніках атэстацыі пацверджана права на дадатковы адпачынак за працу са шкоднымі і (ці) небяспечнымі ўмовамі працы і скарочаная працягласць працоўнага часу» з'яўляецца вынікам старанной працы адпаведнай камісіі пад кіраўніцтвам работнікаў управлення аховы працы і ўтрымлівае 33 пазіцыі. Дадатак 4 «Нормы бясплатнай выдачы сродкаў індывідуальнай абароны работніка БДУ» ўтрымлівае 95 пазіцый. Аднак чалавек уладкаваны так, што ён рызыкуе, не выконвае абавязковых нормаў, і бываюць няшчасныя выпадкі. І работнік, і наймальнік адноўлкава зацікаўлены ў бяспечных умовах працы. І там, дзе ў наяўнасці нядбалы падыход да гэтага пытання, не месца абыякавасці. Прынамсі, патрабуецца ўмяшанне грамадскага інспектара па ахове працы. Хацелася б, каб людзі рабілі адэкватныя ўчынкі.

На што ўплываюць прафгрупаргі?

– Мікраклімат! Прафсаюз адрозніваецца ад прадпрыемства тым, што кіруецца не загадамі. Са штатных работнікаў у нас ёсць ***пяць чалавек, уключаючы 0,5 стаўкі***. Усе астатнія – валанцёры. Гэта людзі са статусам, часцей за ўсё ва ўзросце і не вельмі, скажам так, актыўныя. А працы шмат: улік членства і ўнёскі, колькі шматдзетных, дзеткі-інваліды, хто стаіць у чарзе на кватэры, каб яны абнавілі дакументы... Элементарныя рэчы. Але, да прыкладу, шмат юбілеяў у нас неўзаметку праходзяць, таксама незаўважна людзі з 40–50-гадовым стажам працы ў ЎДУ спыняюць працу. Хіба гэта матывуе маладзейшых на тое, каб звязаць сваё жыццё з БДУ? Пытанне рытарычнае.

Будаўніцтва жылля

– Перад ўніверсітэтам стаіць задача сфарміраваць чаргу і ў адпаведнасці з ёй рэкамендаваць супрацоўнікаў у розныя формы будаўніцтва жылля. У грамадскую камісію па жыллёвых пытаннях, куды на парытэтнай аснове ўваходзяць прадстаўнікі прафсаюза і наймальніка, уваходзяць вельмі адказныя і добрасумленныя людзі. Камісія адсочвае нарматыўную базу, фарміруе чаргу тых, хто мае патрэбу, і калектыў забудоўшчыка. Гэта вельмі складаная праца. Часцяком, каб разабрацца ў сітуацыі, даводзіцца прыцягваць юрыстаў. Да таго ж працуе чалавечы фактар: кожны чалавек бачыць сітуацыю па-свойму. Да прыкладу, па чарзе кватэру трэба прапанаваць чалавеку, а ён кажа, што адмаўляецца ад будаўніцтва ў гэтым доме. На просьбу афарміць пісьмовую адмову (гэта азначае, што яго чарга захоўваецца і яму будзе прапанавана будаўніцтва ў наступным доме) ён кажа: не буду нічога пісаць. Хоць, пакуль ад яго няма адмовы, чарга стаіць. Ёсць недасказанасці і ў заканадаўчай базе. Пішам запыты, на якія не заўсёды атрымліваем ясныя адказы. І шмат такіх нюансаў. На жаль, некаторыя работнікі не разумеюць далікатных зносінаў. Я б хацеў заклікаць усіх быць інтэлігентнымі. Спадзяюся, што фарміруем не апошні дом.

Калектыўная дамова – гэта важна!

– У снежні–студзені мы пачнём рыхтаваць новую Калектыўную дамову, якую трэба будзе прыняць ***у чэрвені 2019 года***. Досыць прачытаць назвы раздзелаў, каб ацаніць, наколькі шырокае кола пытанняў трэба абмяркаваць – і дасягнуць згоды. І гэта праца накіравана на стварэнне найбольш спрыяльных умоў для кожнага работніка і ЎДУ ў цэлым. Хацелася б, каб гэта быў працоўны дакумент.

Да мяне ўжо падыходзілі калегі з немалым стажам працы ў БДУ з пытаннем: а як можна атрымаць матдапамогу? Пра што гэта кажа? Ці вось яшчэ было зададзена пытанне: а чаму з Калектыўнай дамовы прыбралі 4-гадзінны працоўны дзень перад святамі? Так, такое было, але калі прымалі такое рашэнне, мабыць, забыліся, не ўлічылі вялікую катэгорыю работнікаў, у якіх, напрыклад, падсумаваны ўлік працоўнага часу. Як ім аплачваць і з якіх сродкаў тым 4 гадзінны? Ды ва ўсіх іншых выпадках тое ж пытанне.

Таму мы хочам загадзя актывізаваць абмеркаванне новай Калектыўнай дамовы. Хацелася б, каб прафгрупаргі, сакратары прафбюро спачатку нераасэнсавалі ўсе палажэнні, а затым уважліва разабралі ў сваіх падраздзяленнях, унеслі заўвагі па зменах.

Напрыканцы хачу сказаць: як у прадстаўнікоў адміністрацыі, так і ў работнікаў ёсць шмат прычын, каб быць зацікаўленымі ў сіле прафсаюза. Сіла ж грамадскай арганізацыі шмат у чым залежыць ад легітымнасці абранага кіраўніцтва, даверу да яго, а таксама і ад адказнага выканання абранымі людзьмі абавязкаў, ускладзеных на іх калектывам.

Гутарыў
Сяргей ШАФАЛОВІЧ

ПРЫЗНАЧЭННІ

У адпаведнасці з загадам рэктара БДУ ад 07.09.2018 Галоўнае ўпраўленне вучэбнай і навукова-метадычнай работы змяніла назву на Галоўнае ўпраўленне адукацыйнай дзейнасці. Начальнікам Галоўнага ўпраўлення адукацыйнай дзейнасці з 10.09.2018 года прызначана
Алена ДАСТАНКА.

Дастанка Алена Анатольеўна нарадзілася ў 1973 годзе ў Мінску. Кандыдат палітычных навук па спецыяльнасці 23.00.04 «палітычныя праблемы міжнародных адносін, глабальнага і рэгіянальнага развіцця» (1998 г.); дацэнт (2001 г.). З 1998 года працуе на факультэце міжнародных адносін БДУ.

Галіна навуковай дзейнасці – палітычныя праблемы еўразійскай і еўрапейскай інтэграцыі, міжнароднага шматбаковага супрацоўніцтва. З'яўляецца навуковым рэдактарам зборніка навуковых артыкулаў «Актуальныя праблемы міжнародных адносін і глабальнага развіцця».

Лаўрэат III прэміі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў (2005 г.); прэміі НАН Беларусі імя акадэміка В. Ф. Купрэвіча маладым навукоўцам за цыкл прац «Дынаміка еўрапейскай інтэграцыі: працэсы паглыблення і пашырэння» (2007 г.). Абвешчана падзяка рэктара БДУ (2007 г.), ушанавана Ганаровай граматай БДУ (2010, 2015 гг.), Ганаровай граматай Акадэміі навук Рэспублікі Таджыкістан (2014 г.), Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь (2015 г.).

Аўтар больш чым 40 публікацый па інтэграцыйнай праблематыцы, шматбаковым міжнародным супрацоўніцтве Рэспублікі Беларусь, дзейнасці Беларусі ў міжнародных арганізацыях, у тым ліку трох манаграфій па працэсах паглыблення і пашырэння еўрапейскай інтэграцыі, адной з іх – у суаўтарстве.

ВАЖНЫЯ РАШЭННІ

Амаль 500 студэнтаў атрымалі зніжку на навучанне

Пасяджэнне камісіі па вызначэнні зніжак са сфарміраваным коштам навучання адбылося ў БДУ.

Узначаліў камісію рэктар **Андрэй Кароль.** Пасяджэнне прайшло пры ўдзеле дэканаў факультэтаў, дырэктараў інстытутаў і Юрыдычнага каледжа БДУ. Кіраўніцтвам адукацыйных структур папярэдне былі падрыхтаваны адпаведныя дакументы і спісы кандыдатур, якія прэтэндуюць на зніжкі на навучанне.

Па выніках пасяджэння камісія БДУ прыняла рашэнне ў 2018/2019 навучальным годзе даць зніжку 497 студэнтам і навучэнцам. З ліку замежных грамадзян зніжку на навучанне атрымаюць 16 студэнтаў.

Памер зніжак залежыць ад паспяховасці і складае 20, 40 ці 60 %.

Паводле заканадаўства і нарматыўных дакументаў ВНУ зніжэнне аплаты за навучанне даецца тым студэнтам, якія ў папярэднім навучальным годзе паказалі высокія вынікі пры здачы сесіі (не меней за 50 % адзнак 10 і 9 балаў, астатнія – не ніжэйшыя за 6 балаў) і вялі навукова-даследчую і грамадскую працу.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

КУЛЬТУРА

Тэатральны куфар. 15 сезон

За 15 гадоў існавання «Тэатральны куфар» сабраў больш за 2500 удзельнікаў з 200 тэатраў 65 краін. У гэты раз арганізатары вырашылі ўдосталь пайграцца з парадоксамі. Менавіта такая канцэптуальная абалонка абрана для сёлетняга сезона. Пад нязменным дэвізам «Традыцыі. Пошук. Эксперымент» на сцэне міжнароднага фэсту моладзевых тэатраў жывыць гісторыі з класікі і сучаснасці.

Праграма фэсту ўключае 22 пастаноўкі, якія пакажуць з 20 па 27 верасня. Можна будзе ўбачыць дзесяткі па творах У. Караткевіча, Я. Замяціна, У. Шэкспіра, Л. Разумоўскай, С. Алексіевіч, С. Бэкета, Ф. Кафкі, А. Чэхава і іншых аўтараў. Тэатральныя пляцоўкі размесяцца ў ліцэі і на філалагічным факультэце БДУ, а таксама ў Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі.

У фестывальнай праграме заяўлены дзіцячыя, студэнцкія і моладзевыя тэатры, сярод якіх ёсць і аматарскія, і прафесійныя калектывы. Сёлета БДУ прымае больш за 250 артыстаў з 12 краін: Беларусі, Вялікабрытаніі, Грузіі, Ізраіля, Ірана, Латвіі, Літвы, Польшчы, Расіі, Сербіі, Узбекістана, Харватыі.

Асаблівасцю стала наяўнасць у афішы 6 дзіцячых пастановак. На сцэну выйдуць дзеці ва ўзросце 6–16 гадоў з Беларусі, Расіі, Латвіі і Вялікабрытаніі.

Удзельнікаў згуртуе традыцыйны праект фэсту «Куфар-in-Motion». Маладыя артысты на працягу тыдня створаць арыгінальнае дзейства па матывах паэмы «Каін» Д. Г. Байрана пад кіраўніцтвам заслужанага дзеяча мастацтваў Туркменістана, рэжысёра Аўлякулі Хаджакулі. Убачыць вынік сумеснай творчасці можна на цырымоніі закрыцця 27 верасня.

На адкрыцці фэсту 17 верасня прарэктар **Іван Янушэвіч** адзначыў, што фэст стаў прыкметнай з'явай культуры не толькі ў БДУ, але і ў краіне. А выхаваўчыя моманты ў пастаноўках «Тэатральнага куфра» прымусяць задумацца, насычаная праграма напоўніць гледача натхненнем.

Як падкрэсліў начальнік управлення па справах культуры **Уладзімір Макарэвіч**, «Тэатральны куфар» дапамагае раскрывацца маладым талентам. Праз мастацкую тэатральнай сцэны можна павялічыць пазнавальнасць краіны.

– Мы адданыя нашаму дэвізу «Традыцыі. Пошук. Эксперымент» вось ужо 15 гадоў. Выходзячы з яго, мы плануем праграму фэсту. Лічу, што сёння тэатр арыентуецца больш на эксперымент і пошук новых формаў падачы. Напрыклад, Шэкспір і Чэхаў часта сустракаюцца ў нашай праграме, аднак кожны раз гэта новыя падыходы да вядомых твораў, – падзялілася сваім меркаванням дырэктар фэсту «Тэатральны куфар, БДУ» **Кацярына Саладуха**.

Галоўныя прызы «Тэатральнага куфра», які праводзіцца пад эгідай Міжнароднай асацыяцыі ўніверсітэцкіх тэатраў, атрымаюць каманды па выніках галасавання гледачоў па 5-бальнай шкале, таксама сваю ацэнку выкажуць члены прафесійнага журы.

У дзень адкрыцця «Куфра» прайшоў круглы стол: «Студэнцкія і моладзевыя тэатры сёння: праблемы і перспектывы». Удзельнікі прыйшлі да высновы: «Тэатральны куфар» дае зразумець, што хвалюе маладое пакаленне ў наш час.

Таксама было адзначана, што сёння тэатральны рух краіны досыць разрознены: ёсць дзіцячыя, моладзевыя, студэнцкія, аматарскія, прафесійныя калектывы, і прыемна, што менавіта «Тэатральны куфар» аб'ядноўвае гэтых таленавітых людзей.

Абмеркавалі і той момант, што часам са сцен студэнцкіх тэатраў маладыя людзі сыходзяць у акцёрскую прафесію. У прыватнасці, некалькі акцёраў са студэнцкага драматычнага тэатра БДУ «На балконе» пайшлі вучыцца ў тэатральныя ВНУ Беларусі і Расіі. Рэжысёр фэсту і тэатра БДУ **Дзмітрый Цішко** распавёў, што сёння студэнцкія тэатры карыстаюцца папулярнасцю. Напрыклад, у тэатр «На балконе» на праслухоўванне прыйшло каля 140 чалавек, з іх адабралі толькі 8 студэнтаў. Дзмітрый лічыць, што, магчыма, варта было б весці на некаторых факультэтах спецкурсы па акцёрскім майстэрстве, асабліва тэатра спатрэбілася б на тых спецыяльнасцях, дзе важна мець камунікатыўныя навыкі.

Алена ЛЯЎШЭНЯ

НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

03 кастрычніка Васіленка Жанна Вітальеўна, дацэнт кафедры тэхналогій праграмавання, факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі

04 кастрычніка Байчораў Аляксандр Мухтаравіч, прафесар кафедры міжнародных адносін, факультэт міжнародных адносін

05 кастрычніка **Чаргінец Дзмітрый Мікалаевіч,** дацэнт кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў і сістэмнага аналізу, механіка-матэматычны факультэт

07 кастрычніка Калачова Ірына Іванаўна, прафесар кафедры сацыяльнай камунікацыі, факультэт філасофіі і сацыяльных навук

07 кастрычніка Краўчанка Іван Цімафеевіч, дацэнт кафедры радыёфізікі і лічбавых медыятэхналогій, факультэт радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій

08 кастрычніка Бялова Тамара Аляксееўна, прафесар кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права, юрыдычны факультэт

08 кастрычніка Шамякіна Таццяна Іванаўна, загадчык кафедры тэорыі літаратуры, філалагічны факультэт

10 кастрычніка Іваноў Красімір Іванавіч, дацэнт кафедры тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства, філалагічны факультэт

13 кастрычніка Захаркевіч Сцяпан Артуравіч, дацэнт кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтва гістарычны факультэт

14 кастрычніка Шаўрова Вольга Генадзьеўна, дацэнт кафедры філасофіі і метадалогіі навукі, факультэт, філасофіі і сацыяльных навук

19 кастрычніка Сарокін Віктар Леанідавіч, дацэнт кафедры радыяцыйнай хіміі і хімікa-фармацэўтычных тэхналогій, хімічны факультэт

22 кастрычніка Буднік Анатоль Міхайлавіч, дацэнт кафедры вылічальнай матэматыкі, факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі

22 кастрычніка Мяльсітава Іна Уладзіміраўна, дацэнт кафедры аналітычнай хіміі, хімічны факультэт

25 кастрычніка Гуліс Іна Валер'еўна, дацэнт кафедры псіхалогіі, факультэт філасофіі і сацыяльных навук

29 кастрычніка Навумовіч Уладзімір Аляксандравіч, старшы выкладчык кафедры гісторыі беларускай літаратуры, філалагічны факультэт

30 кастрычніка Дзенісюк **Ніна Паўлаўна,** дацэнт кафедры паліталогіі, юрыдычны факультэт

30 кастрычніка Ніканава Наталля Мікалаеўна, дацэнт кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права, юрыдычны факультэт

АБ'ЯВЫ

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: перыядычнага друку, гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу, гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў, крыніцазнаўства, экалагічнага і аграрнага права, грамадзянскага права, дзяржаўнага кіравання, тэорыі літаратуры.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.

ІНСТЫТУТ ЯДЗЕРНЫХ ПРАБЛЕМ БДУ
АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАДЫ:

СТАРШАГА НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА лабараторыі тэарэтычнай фізікі.

Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220050, г. Мінск, вул. Бабруйская, 11, адзел кадраў, пакой 315, тэл. 226 42 31.

БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

Лётчыкі-касманаўты з чатырох краін упершыню, у рамках 31-га Міжнароднага кангрэса Асацыяцыі ўдзельнікаў касмічных палётаў, наведалі БДУ – БелТА (10.09), СТБ, МІНСК-ТБ, АНТ, БелРасТБ, радыё «Сталіца», 1-ы Нацыянальны канал Беларускага радыё, wuz.by, belarus.by, zviazda.by (12.09), edu.gov.by (13.09).

Інавацыйны студэнцкі білет для першакурснікаў БДУ – БелТА, sb.by, wuz.by, «Мінск-навіны», telegraf.by, belbankir.by, БелаПАН, kadrovik.by, ekonomist.by, belrynok.by, zviazda.by (30.08), rambler.ru, «Рэспубліка» (31.08), БТ-1 (04.09), «Звязда» (05.09), СТБ (12.09).

Летняя школа журналістыкі «Адукацыя журналіста ў кантэксце лічбавых тэхналогій» адбылася ў БДУ – wuz.by (10.09), СТБ, 21.by, aif.by, mininform.gov.by, sb.by (13.09), «СБ-Беларусь сёння», «Рэспубліка» (14.09).

Міжнародны летні ўніверсітэт юрыстаў прайшоў у БДУ – ecopress.by, interfax.by, 21.by, sb.by (13.09).

Больш за 30 навукова-тэхнічных распрацовак БДУ былі прадстаўлены на выставе беларускіх вытворцаў «Made in Belarus» у Ташкенце – БелТА, ecopress.by (10.09), mail.ru, zviazda.by (12.09).

Узбагачальныя фітакомплексы для мясных вырабаў распрацаваны навукоўцамі БДУ – sb.by (04.09), wuz.by (05.09), reform.by (07.09), zviazda.by (08.09).

Першакурснікі ФПМІ БДУ заваявалі ўзнагароды рознай вартасці на Міжнародным алімпіядзе школьнікаў па інфарматыцы (IOI–2018) – edu.gov.by, «Мінск-навіны», wuz.by, БелТА, zviazda.by (06.09), mingorspravka.by (07.09), «Настаўніцкая газета» (13.09).

«Школы юных» адкрываюць новы адукацыйны сезон у БДУ – wuz.by (06.09), ecopress.by (07.09), zviazda.by (09.09).

Спартыўна-забаўляльная акцыя «Фотавеламарафон» была арганізавана ў БДУ – mosk.minsk.gov.by (30.08), wuz.by (04.09), zviazda.by (05.09), «Мінск-навіны» (08.09).

Дзень ведаў адсвяткавалі ў БДУ – church.by, voskresenskiy.by (01.09), wuz.by, patriarchia.ru, sputnik.by (02.09), БТ-1 (04.09).

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

25 верасня 2018 года, № 13 (2201) УНІВЕРСІТЭТ

ПАДЗЕЯ

Марыя Ранка на сустрэчы са студэнтамі геаграфічнага факультэта

Іанна Лі Фішэр на хімфаку БДУ

Валерый Токараў

Кевін Форд

Віктар Савіных

Арнэ Фуглесанг у НДІ імя А. Н. Сеўчанкі

Джэфры Хофман са студэнтамі фізфака БДУ

Космас стаў бліжэй!

У рамках кангрэса астранаўты і касманаўты пагутарылі з тымі, каму ствараць касмічную будучыню – са школьнікамі, студэнтамі, навуковымі супрацоўнікамі. БДУ наведалі 12 заваёўнікаў космасу з Расіі, ЗША, Германіі і Швецыі. «Касмічныя» лекцыі, на якіх можна было даведацца тое, пра што не пішуць у падручніках, адбыліся на шасці факультэтах: біялагічным, геаграфічным, механіка-матэматычным, фізічным, хімічным, радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій, а таксама ў Інстытуце прыкладных фізічных праблем імя А. Н. Сеўчанкі.

Герхард ЦІЛЕ (Германія): «Касмічны палёт, у якім я браў удзел, рыхтавалі больш за 300 спецыялістаў, але знакамітымі на ўвесь свет сталі толькі тыя 6 чалавек, што пабылі ў космасе»

Нямецкі фізік і астранаўт Герхард Ціле здзейсніў свой адзіны касмічны палёт у 2000 годзе. Галоўнай задачай гэтага палёту з'яўлялася выкананне радарнай тапаграфічнай здымкі паверхні Зямлі. Складанне трохмерных лічбавых картаў зямной паверхні з высокім разрозненнем выконвалася ўпершыню, аднак, распавядаючы студэнтам пра касмічную місію, Герхард зрабіў акцэнт не на тэхнічных складанасцях задання, а на камандзе:

– Хто з'яўляецца адказным за палёт і выкананне задання? Я задаваў гэта пытанне ў розных аўдыторыях і часцей за ўсё чуў адказ: «Астранаўты». Насамрэч, такі адказ дакладны толькі часткова. У нашым выпадку палёт рыхтавалі больш за 300 чалавек: навукоўцы, інжынеры, тэхнічныя спецыялісты. Падрыхтоўка пачалася за тры гады да запуску, а калі мы вярнуліся на Зямлю, то навукоўцы апрацоўвалі і аналізавалі атрыманыя намі дадзеныя яшчэ два гады. У выніку ўся праграма заняла пяць гадоў, над ёй працавала вялікая колькасць людзей, але знакамітымі сталі толькі тыя 6 чалавек, якія 11 дзён правялі ў космасе. Я хачу звярнуць вашу ўвагу, што калі б не вялікая каманда спецыялістаў, то шатл ніколі б не адарваўся ад Зямлі і наогул не дасягнуў бы космасу.

І, вядома, кай палёт адбыўся, а заданне было выкананa паспяхова, вельмі важная камунікацыя:

– Мы ўсе людзі, і ўсе робім памылкі, але самыя сур'ёзныя з іх адбываюцца з-за неразумення. Вы ўспрымаеце тое, што я кажу, зыходзячы са свайго бачання свету, і наадварот. Таму астранаўты прыкладваюць вялікія высілкі, каб паміж імі не паўстала непаразуменне. Я са сваімі калегамі да палёту правёў 18 месяцаў, мы працавалі побач і за гэты час навучыліся разумець без слоў, што чалавек збіраецца сказаць ці зрабіць. Усё дзякуючы адналу правілу, якое ўвёў наш камандзір: задаваць адзін аднаму пытанні, ведаючы на іх адказ. Гучыць вельмі дзіўна. Насамрэч, навошта мне штосьці пытаць, калі я ведаю адказ? Аднак гэта сапраўды працуе, бо, калі я атрымліваю адказ прыкладна такі, як і чакаў – значыць, камунікацыя прайшла паспяхова, але калі адказ наогул нечаканы, то або я зусім не зразумеў сітуацыі, што вельмі дрэнна ў космасе, або чалавек не ўцяміў сутнасці майго пытання.

Лорэн ЭКТАН (США): «Не варта баяцца складаных рэчаў, таму што яны могуць прывесці да добрых вынікаў, напрыклад, да палёту ў космас»

Свой палёт у космас Лорэн Эктан здзейсніў як навуковец-даследчык, у яго абавязкі ўваходзіла правядзенне навуковых даследаванняў Сонца і іншых нябесных аб'ектаў з выкарыстаннем перадавых тэхналогій даследавання прасторы. Аднак яго палёт мог і не адбыцца:

– Пасля доўгіх гадоў падрыхтоўкі ў лістопадзе 1985 г. наш карабель быў гатовы да палёту. Гэта быў выдатны дзень у Фларыдзе, і ўсё ішло цудоўна, але, калі мы ўжо знаходзіліся на борце і павінны былі ўзлятаць, за 3 секунды да старту камп'ютары выявілі праблему ў адным з асноўных рухавікоў – гэта былі дрэнныя навіны для нас. Запуск перанеслі, і «Чэленджар» усё-такі ўзляцеў праз 17 дзён. За гэты час я паспеў наведаць усе вечарынкі, якія былі арганізаваны ў Фларыдзе з нагоды нашага старту, – смеючыся, успамінае Лорэн.

З яго выступлення зразумела, што складанасцяў па жыцці астранаўт не баіцца і ва ўсім шукае плюсы:

– Калі мне трэба было вызначацца з прафесіяй і паступаць ва ўніверсітэт, мой брат параіў мне занятца фізікай, ён сказаў, што варта заняцца самай складанай рэччу, у якой я магу дасягнуць поспеху. Я паслухаўся яго парады і пазней заняўся навукай, што потым прывяло мяне да таго, што я стаў спецыялістам па карыснай нагрузцы на касмічным караблі. Не варта баяцца складаных рэчаў, яны могуць прывесці да добрых вынікаў.

Падчас палёту ў каманды былі цікавыя і важныя задачы – вывучэнне інфрачырвоных прамянёў, Сонца. Пасля сур'ёзных спраў экіпаж разнявольвала музыка: Лорэн – першы астранаўт, які ўзяў у космас гармоніку, «мы ігралі і спявалі, гэта было вельмі фальшыва, але давала магчымасць адпачыць». Без памылак у эксперыменце тым не менш не абышлося:

– Падзялюся сумнай, але вельмі важнай гісторыяй пра тое, як падчас палёту я дапусціў сур'ёзную памылку. Гэта быў вельмі просты эксперымент, я ведаў, як яго выконваць, аднак чалавеку ўласціва забываць, як рабіць некаторыя рэчы. Больш за 30 гадоў мая памылка не дае мне спакою, я думаў пра прычыны і прыйшоў да высновы: не хапіла практыкі. У мяне ёсць для вас адна парада: калі робіце нейкую важную рэч, то вам варта працаваць і працаваць не да таго моманту, калі вы зможаце ўсё зрабіць правільна, а да таго моманту, пакуль у вас проста не атрымаецца зрабіць няправільна.

Лусід ШЭНАН (ЗША): «Я не магла паляцець у космас і працавала нянечкай у бальніцы проста таму, што я жанчына»

У Лусід Шэнан на рахунку пяць касмічных палётаў, уключаючы рэкордны для жанчын палёт на станцыі «Мір» працягласцю 188 сутак (1996 год). Аднак доўгія гады пра космас яна магла толькі марыць, паколькі жанчын у астранаўты не бралі:

– У дзяцінстве я вельмі любіла чытаць, і пасля таго, як мне пашанцуе прачытаць адну кнігу ў жанры фантастыкі, я стала марыць, што адной з наступных даследуе Сусвет. Калі я была ў старэйшых класах, першыя людзі ўжо паляцелі ў космас. Гэта быў выдатны час – з адной заўваг-гай: у Амерыцы толькі мужчыны маглі паляцець у космас. І што я магла зрабіць? Вырашыла, што буду шмат старацца, пайду ва ўніверсітэт і займуся біхіміяй. У той жа час я ездзіла ў аэраклуб і вучылася лётаць на самалётах. Пасцілa за гэтыя заняткі сама, працавала ва ўніверсітэце і ў рэстаране па 10 гадзін, каб 1 гадзіну палётаць, але гэта сапраўды таго было варта. Аднак, калі надышоў час выпуску з універсітэта, я не змагла знайсці працу па спецыяльнасці, проста таму, што я жанчына, мяне ўзялі толькі нянечкай у бальніцу. Пазней жыццё пачало наладжвацца, і я знайшла сабе месца ў лабараторыі, а потым атрымала навуковую ступень, праўда, і тады знайсці добрую працу было складана. Усё змянілася, калі ўрад ЗША выдаў закон, які забараняў дыскрымінацыю па палавой прыкмеце. У гэты ж час у навуковым часопісе я прачытала, што НАСА набірае новую групу для падрыхтоўкі астранаўтаў да палётаў, у тым ліку адгадайце каго? Правільна, жанчын. Я ў той жа дзень адправіла заяўку, і мяне прынялі. Лічу, што мне вельмі пашанцавала.

Марыа РАНКА (ЗША): «Сустрэча з адкрытым космасам – гэта, не лічачы жонкі і дзяцей, самы дзівосны і запамінальны досвед у маім жыцці»

Цяпер астранаўт Марыа Ранка выкладае ва ўніверсітэце, а яго першы палёт адбыўся яшчэ ў 1991 годзе з ваеннай мэтай, хутка адбыліся і іншыя – у 1993 і 1996 гадах. У гэтых палётах ён выводзіў спадарожнік сувязі, які выкарыстоўваецца дагэтуль. Студэнтам астранаўт паспрабаваў паказаць праз свае здымкі, як гэта – бачыць космас уласнымі вачыма, а яшчэ распавёў пра стасункі з сям'ёй:

– Калі ў астранаўта ёсць хоць кропелька рамантыкі, ён адразу думае пра жонку, якая засталася дома. У палёце спіцца вельмі дрэнна, баліць паясніца, але аднойчы мне прысніласа, што мы з жонкай сядзім побач, паміж намі свечка (а агонь унутры шатла запальваць катэгарычна нельга!), атрымліваем асалоду ад рамантычнай вячэры і касмічных відаў.

Сустрэча з адкрытым космасам у астранаўта адбылася падчас другой экспедыцыі. Гэта, не лічачы яго жонкі і дзяцей, самы дзівосны і запамінальны досвед у жыцці. «Калі я паглядзеў пад ногі, то зразумеў, што нам яшчэ вельмі-вельмі далёка да Зямлі», – кажа ён.

Марыа Ранка палёты дапамаглі паглядзець па-іншаму на родную Зямлю, планета стала яму вельмі блізкая, і зараз яму не трэба выкарыстоўваць карту, каб зразумець, дзе ён знаходзіцца. З касмічнай вышыні ён разгледзеў прызлізую сінечу Багамскіх астравоў, убачыў тайфун у Ціхім акіяне, палярнае ззянне і егіпецкія піраміды... А яшчэ – пласт атмасферы. Ён не вельмі тоўсты, і гэта дзіўна, што ад яго залежыць наша жыццё на планеце. «Мы павінны быць удзячныя атмасферы за тое, што яна нас абараняе», – з павагай кажа астранаўт.

Валерый ТОКАРАЎ (Расія): «Я рос у вёсцы і ў дзяцінстве пра космас нават не ведаў»



Касманаўт-выпрабавальнік, расійскі палкоўнік ВПС Валерый Токараў падчас свайго выступлення перад студэнтамі паказаў фільм пра гістоплюс завязанне космасу, а таксама відэа з асабістага архіва, дапаўняючы яго сваімі каментарыямі. Ён распавёў і паказаў, як у космасе вырашаюць такія бытавыя праблемы, як сон і прыём ежы. Валерый Токараў распавёў, што, калі бачыш Зямлю ў ілюмінатары, адчуваеш эйфарыю, аднак нельга надоўга паддавацца гэтаму пачуццю, бо дзень касманаўта распісаны па хвілінах, ёсць расклад і пратаколы, пра якія нельга забываць. «Калі я апынуўся ва ўмовах бязважкасці, мне адразу захацелася куляцца, рабіць усё хутка, але дасведчаныя калегі папярэдзілі, што вельмі хутка можа з'явіцца нават вестыбулярнае парушэнне», – распавядае касманаўт. Ён адзначыў, што касмічнае спаборніцтва, якое праходзіла паміж ЗША і СССР у мінулым стагоддзі, дало каласальныя вынікі для развіцця, а цяпер развіваць касмічную навуку трэба новаму пакаленню. «Каму, як не вам?» – звярнуўся Токараў да студэнтаў з заклікам.

Кевін ФОРД (ЗША): «У другі раз я лётаў у космас з двума калегамі і 34 рыбкамі, якіх даглядаў»

Палкоўнік ВПС ЗША Кевін Форд распавёў студэнтам пра навуковую дзейнасць на Міжнароднай касмічнай станцыі:

– У космасе часта праводзяць медыцынскія выпрабаванні, эксперыменты з фізічнымі з'явамі, генамі, ДНК. Навукоўцам цікава, што адбываецца з жывымі арганізмамі ва ўмовах бязважкасці і касмічнай радыяцыі. У другі раз я лётаў у космас з двума калегамі і 34 рыбкамі, якіх даглядаў», – смеючыся, адзначыў Кевін. – Так, падчас даследаванняў было выяўлена, што ў космасе жывёлы губляюць касцяную масу.

Таксама амерыканскі астранаўт распавёў пра канструкцыю МКС, паказаў студэнтам мноства фатаграфій, у тым ліку здымак Мінска:

– Было вельмі чароўна бачыць Мінск з космасу, і прыемна бачыць горад зараз з зямлі і быць сярод вас. Дарэчы, падчас майго другога палёту камандзірам экіпажа быў ваш суайчыннік Алег Навіцкі. Гэта гонар для мяне – папрацаваць з ім, я атрымаў фантастычны досвед, мы працавалі разам як браты.

Кевін Форд распавёў, што ў касмасе не мае значэння нацыянальнасць, няма канфліктаў, усе працуюць і адпачываюць разам, як сапраўдная сям'я. Нягледзячы на тое, што Міжнародная касмічная станцыя складаецца з некалькіх модуляў, якія належаць розным краінам, усе касманаўты дзеляць паміж сабой энергію, якую атрымліваюць з дапамогай сонечных батарэй, а таксама сродкі камунікацыі і санітарную зону.

Антон ШКАПЛЕРАЎ (Расія): «Шанец паляцець у космас ёсць у спецыялістаў розных профіляў. Вучыцеся!»

Свой крайні палёт касманаўт Антон Шкаплераў завяршыў зусім нядаўна, 3 чэрвеня, і цяпер знаходзіцца на рэабілітацыі. Сустрэчу са студэнтамі касманаўт пачаў з адкрыцця: ён ганарыцца, што ў яго жылах цячэ беларуская кроў (бацькі Антона Мікалаевіча беларусы). Сёння Антон Шкаплераў дзейны касманаўт, здзейсніў ужо тры палёты працягласцю больш за 500 сутак, у двух з іх выходзіў у адкрыты космас, а ў аснове бліскучай кар'еры – дзіцячая мара:

– Мой бацька быў мараком, але мяне заўсёды цягнула ў неба. Нагул, у той час, калі я нарадзіўся, усе хлопчыкі і нават дзяўчаты марылі стаць касманаўтамі, я не стаў выключэннем. Прачытаўшы шмат кніг і паглядзеўшы шмат фільмаў пра касманаўтаў, я вырашыў, што будзе правільна, калі на шляху да космасу я асвою прафесію лётчыка. Пасля ўрокаў я стаў хадзіць у аэраклуб і займацца авіяцыйным спортам. У 16 гадоў я ўжо самастойна кіраваў самалётам, такім чынам, я пачаў кіраваць самалётам раней, чым атрымаў аўтамабільныя правы. Пасля школы было авіяцыйнае вучылішча і ваенна-павет-раная акадэмія, а ў 30 гадоў паспрабаваў адабрацца ў атрад касманаўтаў. Адбор я прайшоў і стаў рыхтавацца да першага палёту – 8 гадоў. Не думайце, што гэта доўга, вось мой дублёр у палёце рыхтаваўся 15 гадоў, часам людзі чакаюць сустрэчы з космасам і даўжэй.

Антон Мікалаевіч паказаў студэнтам фільм, які дапамог зразумець, чым займаюцца касманаўты на карабелі ад моманту старту да пасадкі. А на пытанне: «У студэнтаў якіх спецыяльнасцяў ёсць шанец паляцець у космас?» – адказаў так:

– У савецкі час для палётаў у космас адбіралі толькі лётчыкаў, інжынераў і дактароў, пазней паляцелі біёлагі, а сёння магчымасць патрапіць у каманду ёсць у многіх спецыялістаў. Я, напрыклад, у сваім крайнім палёце лётаў з двума настаўнікамі, гэта значыць, што яны працавалі педагогамі перад тым, як прыйшлі ў НАСА. Мая вам парада: вучыцеся і імкніцеся.

Валерыя БАНДАРЧЫК, Надзея МАРХЕЛЬ, Дар'я КОЎЗА
Фота Васіля КУЗЬМІЧКІНА, Таццяны БАГАМАЗАВАЙ і Яўгена ПАМЫТКІНА

Савет маладых навукоўцаў як брэнд

У пошуку сябе і новых магчымасцяў

«Натхненне. Маладосць. Поспех» – такі лозунг Савета маладых навукоўцаў (СМН) БДУ. І варта адзначыць, ён цалкам адпавядае брэнду арганізацыі і асноўным задачам яе дзейнасці. Вось ужо амаль год СМН узначальвае **Наталля АНЦУХ,** дацэнт кафедры міжнароднага прыватнага і еўрапейскага права ФМА, кандыдат юрыдычных навук, дацэнт. Рэдакцыя даведалася ў Наталлі, якія падзеі ўжо ўвайшлі ў гісторыю СМН, а таксама спытала пра тое, як праводзяць заняткі маладыя навукоўцы ў БДУ.

Вектары дзейнасці СМН БДУ

Дзейнасць СМН БДУ накіравана на павышэнне ролі маладых навукоўцаў у рашэнні актуальных задач, якія стаяць перад БДУ ў навукова-адукацыйнай, даследчай і інавацыйнай сферах. Працу савет вядзе па чатырох асноўных напрамках: далучэнне моладзі да навукі, міжнароднае супрацоўніцтва, а таксама пошук шляхоў найлепшай медыйнай прэзентацыі ўніверсітэцкай моладзі і камерцыялізацыя навуковай дзейнасці.

– З дапамогай распрацаванай медыястратэгіі (курыруе даддзены аспект дацэнт факультэта журналістыкі Алеся Кузьмінава) мы імкнёмся падтрымліваць пазітыўны імідж СМН, а таксама статус маладога навукоўца ў цэлым, – распавядае Наталля Анцух. – На адным з першых пасяджэнняў савета вырашылі, што СМН БДУ – гэта брэнд. Яго трэба папулярызаваць, таму ўжо ў самым пачатку працы мы падключылі нашу патэнцыйную аўдыторыю да распрацоўкі лагатыпа і слогана – правялі конкурс сярод навучэнцаў і супрацоўнікаў. Да нашай радасці, знайшлося больш за 30 удзельнікаў: свае ідэі прапанавалі студэнты, магістранты, аспіранты і выкладчыкі. Па выніках конкурсу была абрана канцэпцыя ад групы аўтараў. Цэнтр карпаратыўных камунікацый дапамог аформіць дызайн у адпаведнасці з брэндбукам БДУ.

У наш час пры падтрымцы Цэнтра карпаратыўных камунікацый распрацоўваецца візуальнае афармленне для сацыяльных сетак Facebook, «Укантакце» і Instagram. Па словах старшыні СМН, тры анлайн-платформы дапамогуць ахапіць вялікую аўдыторыю. Пасродкам гэтых інструментаў можна будзе паказаць, што ў свеце навукі адбываецца мноства арыгінальных падзей, а навукоўцы – гэта крэатыўныя і эрудзіраваныя людзі.

Яшчэ адзін праект маладых навукоўцаў, які рэалізуецца пры падтрымцы ЦКК, – «Навуковы мікрафон БДУ». У дадзены момант для яго рыхтуюцца ролікі ў выглядзе інтэрв'ю, у якіх героі распавядаюць пра свае навуковыя дасягненні, прыводзяць цікавыя факты пра сябе, дзелячца планамі.

– Усё пачалося з думкі пра тое, што ў БДУ варта адкрыць пляцоўку для апрабацыі навуковых вынікаў, – працягвае Наталля. – Часам карысна выйсці за рамкі працы над тэмай і пачуць меркаванне збоку, бо гэта дае новы імпульс і натхненне для далейшых даследаванняў. «Навуковы мікрафон БДУ» закліканы даць маладым навукоўцам магчымасць не толькі прэзентаваць вынікі сваіх даследаванняў шырокай аўдыторыі, але і развіць навыкі публічнага выступлення, магчымасць знайсці суаўтараў. Паколькі на лекцыі навукоўцаў змогуць прыходзіць госці з усіх падраздзяленняў БДУ, хочацца, каб праект стаў стартам для міждысцыплінарных даследаванняў, каб навукоўцы з розных галін навукі змаглі папрацаваць разам.

Яшчэ адзін важны напрамак, над якім працуе СМН, – пошук варыянтаў камерцыялізацыі вынікаў даследаванняў. Пра гэта Наталля Анцух кажа так:

– Маладыя навукоўцы плануюць браць удзел у рацыянальным развіцці эканамічнай і прадпрымальніцкай дзейнасці Тэхнапарка БДУ. Мы задаліся пытаннем, якім чынам і якія праекты трэба стварацьі, каб атрымліваць фінансавыя вынікі. У наш час прапрацоўваем пытанне пра стварэнне краўдфандынгавай платформы ў рамках праекта «Навуковы мікрафон БДУ», каб даць магчымасць калегам манетызаваць тыя навуковыя ідэі, пра якія яны кажуць.

Падзеі ў жыцці маладых навукоўцаў за год

Наталля Анцух стала старшынёй СМН у канцы кастрычніка 2017 года. Па яе словах, пасля абнаўлення складу савета каманду згуртавала рэспубліканская падзея. Гаворка ідзе пра мерапрыемствы, прымеркаваныя да II З'езда навукоўцаў Рэспублікі Беларусь, які праводзіліся ў лістападзе–снежні 2017 г.



– Агульная справа дала нам магчымасць адчуць сябе камандай, а згуртаваная праца з'яўляецца закладам поспеху ў любой сітуацыі, – кажа старшыня.

Увесну-ўлетку саветам было арганізавана некалькі адкрытых лекцый у БДУ. Абмяркоўваліся тэмы, звязаныя з інтэлектуальнай уласнасцю, тайм-менеджментам, быў прадстаўлены Instagram-праект «Фізіка для ўсіх».

Маладыя навукоўцы СМН БДУ выявілі сябе і за межамі краіны. У прыватнасці, у якасці членаў Савета маладых навукоўцаў яны прадставілі даклады на «Другім Беларуска-пакістанскім форуме маладых навукоўцаў», міжнароднай канферэнцыі «Распаўсюджанне прынцыпаў талерантнасці, гуманізму і міралюбнасці ў моладзевым асяроддзі» ў Азербайджане.

Увосень плануецца правесці круглы стол на трэндавую тэму, звязаную з інавацыямі і ўстойлівым развіццём. У планах падрыхтаваць шэраг адкрытых лекцый, а яшчэ цыкл мерапрыемстваў для студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў па напісанні навуковых прац. Акрамя гэтага маладыя навукоўцы хочуць зрабіць праект па ландшафтным дызайне для галоўнага дворыка ВНУ.

Пра працу са студэнтамі

Навука, праца, сям'я – часта графік маладых навукоўцаў распісаны па хвілінах. Як эфектыўна выкарыстоўваць час, ведае старшыня савета Наталля Анцух. У свой час яна скончыла школу з залатым медалём, ФМА з адзнакай і была ўзнагароджана дыпломам БДУ «Найлепшы выпускнік 2007 года».

– За вобразам маладога навукоўца стаіць каласальная праца. Каб дасягнуць добрых навуковых вынікаў, трэба шмат часу прысвяціць пытанню, якое вывучаеш, – дзеліцца меркаваннем Наталля.

Наталля з'яўляецца аўтарам больш чым 80 навуковых прац у галіне сямейнага, медыцынскага і міжнароднага прыватнага права, сярод якіх ёсць дапаможнік для магістрантаў і манаграфіі (як адна-асобныя, так і калектыўныя). За цыкл навуковых прац у галіне параўнальнага і міжнароднага сямейнага права ў 2017 годзе была ганаравана прэмія імя У. І. Пічэты ў намінацыі «Навука» (кандыдаты навук да 35 гадоў).

– Цяпер рыхтуюся да паступлення ў вочную дактарантуру. Я вывучаю праблемы прававога забеспячэння міжнароднага медыцынскага турызму, планую даследаваць даддзены напрамак у дактарскай дысертацыі, – распавядае яна пра свае мэты.

Заняткі Наталля праводзіць з прымяненнем інтэрактыўных формаў навучання, выкарыстоўвае ІТ-тэхналогіі для падачы матэрыялу студэнтам і магістрантам.

– Мне падабаецца заходзіць у аўдыторыю, калі ў студэнтаў гараць вочы, калі ўсе прыходзяць на заняткі, ведаючы, што будзе цікава. Імкнуся правесці заняткі так, каб у студэнтаў было жаданне працягнуць вывучаць разгледжаныя пытанні самастойна. Бо галоўнае – гэта навучыць вучыцца, каб студэнты маглі ў будучыні вырашыць любую пастаўленую перад імі задачу, – распавядае Наталля. – З калегамі дадаткова праводзім гурткі па сямейным і міжнародным прыватным праве, каб дапамагчы студэнтам разабрацца ва ўсіх тонкасцях. На заняткі запрашаем юрыстаў-практыкаў, каб яны падзяліліся сваім досведам працы.

Старшыня СМН лічыць, што схільнасць да навукі ў студэнта можна разглядзець ужо на першых курсах:

– Як навуковы кіраўнік, імкнуся максімальна зразумела растлумачыць студэнтам і магістрантам, як працаваць з навуковым матэрыялам. Радуе, што яны прыслухоўваюцца і пасля годна абараняюць курсавыя, дыпломныя і магістарскія працы. Заўсёды падказваю, калі ў БДУ праводзяцца конкурсы, навуковыя канферэнцыі і іншыя мерапрыемствы, дзе хлопцы і дзяўчаты могуць сябе выявіць.

Наталля з цеплынёй успамінае ўдзельнікаў праекта «Студэнт на тыдзень БДУ». Яны зазірнулі да яе на заняткі па парадзе студэнтаў, а на наступны дзень усім складам прыйшлі да яе яшчэ і на гурток.

Як патрапіць у Савет маладых навукоўцаў?

У склад СМН БДУ ўваходзяць старшыні саветаў маладых навукоўцаў падраздзяленняў (факультэтаў, інстытутаў). На сёння гэта калектыў з 22 чалавек.

У сваю чаргу савет падраздзялення складаецца з маладых навукоўцаў, якія тут працуюць на кафедрах, у лабараторыях. Да дзейнасці гэтай арганізацыі таксама прыцягваюцца аспіранты і магістранты.

Што да ўзроставых рамак, то членамі Савета маладых навукоўцаў могуць быць выкладчыкі і навуковыя работнікі ва ўзросце да 35 гадоў, дактаранты да 40 гадоў, са ступенню доктара навук да 45 гадоў.

– Мы заўсёды рады бачыць сярод членаў савета ініцыятыўных і крэатыўных супрацоўнікаў БДУ, якія разумеюць, што СМН БДУ – гэта грамадскі орган, які патрабуе актыўнага ўдзелу і ўменняпрацаваць у камандзе.

Савет маладых навукоўцаў выказвае падзяку кіраўніцтву ўніверсітэта за падтрымку нашых ініцыятыў, плённае супрацоўніцтва па ключавых напрамках дзейнасці савета, садзейнічанне ў самарэалізацыі ўніверсітэцкай моладзі.

Гутарыла
Алена ЛЯЎШЭНЯ

FABLAB – сучасная майстэрня інавацый

Ствараць сеткавую інфраструктуру для падтрымкі інавацыйнага прадпрымальніцтва моладзі на платформах вытворчых лабараторый – на гэта накіравана праца праекта FABLAB. Майстэрня дае ўсім ахвотнікам магчымасць індывідуальнага самастойнага вырабу неабходных ім прадуктаў ці дэталяў. Як функцыянуе праграма і якія ідэі рэалізуе?

Фота Васіля КУЗЬМЕНКІ

Сяргей Хвясеня і Васіліна Раманенкава

Карані праекта

Сёлета ў ліпені на базе кафедры тэарэтычнай і прыкладной механікі і НДЛ «Прыкладная механіка» механіка-матэматычнага факультэта БДУ сумесна з аддзелам міжнародных праграм і праектаў УМС была адкрыта вытворчая лабараторыя FABLAB.

– Праект FABLAB мае вытокі ў стартап-цэнтры па развіцці і праскуванні інавацый студэнтаў SUCSID, праграме TEMPUS. Ён рэалізоўваўся кансорцыумам партнёраў з краін ЕС і СНД, – тлумачыць менеджар праекта FABLAB **Васіліна РАМАНЕНКАВА,** спецыяліст аддзела міжнародных праграм і праектаў. – Пазней амаль тым жа кансорцыумам быў створаны праект FABLAB у якасці лагічнага працягу атрымання досведу, перанесенага на новы напрамак.

FABLAB накіраваны на распрацоўку асяроддзя, якое будзе стымуляваць інжынерную творчасць і прадпрымальніцкую дзейнасць, таксама ён паспрыяе працаўладкаванню моладзі з дапамогай сеткавай інфраструктуры ўзаемадзеяння ўніверсітэтаў, бізнесу і прамысловасці на платформах вытворчых лабараторый. Працягласць праекта – 3 гады.

– FABLAB была адкрыта Нілам Гершэнфельдам амаль 20 гадоў назад у цэнтры бітаў і атамаў Масачусецкага тэхналагічнага інстытута (ЗША). Універсітэцкі праект, які першапачаткова прадугледжваў навучанне працы невялікай групы студэнтаў на наяўным у цэнтры вытворчым абсталяванні, ператварыўся ў глабальную сетку лабараторый, якія падзяляюць агульныя прынцыпы, выкарыстоўваюць падобнае абсталяванне і тэхналогіі, абменьваюцца ідэямі і рэсурсамі, – распавёў кіраўнік працоўнай групы праекта FABLAB **Сяргей ХВЯСЕНЯ,** загадчык НДЛ «Прыкладная механіка» кафедры тэарэтычнай і прыкладной механікі.

– Праект FABLAB атрымаў адабрэнне Еўрапейскай камісіі ў кастрычніку 2015 года, – працягвае Васіліна Раманенкава. – А пасля праходжання працэдуры рэгістрацыі ў Міністэрстве эканомікі з мая 2016 года пачаліся мерапрыемствы па рэалізацыі праекта ў Беларусі.



3D-прынтар Flashforge Dreamer

3D-прынтар Creatbot DX+

3D-сканер Einscan-Pro



3D-прынтар Flashforge Finder

Абсталяванне лабараторыі

Па словах кіраўніка праекта, у лабараторыі можна стварыць для сябе адзін унікальны прадмет, а таксама выпусціць дробную партыю чаго-небудзь дзякуючы сучаснаму абсталяванню, якое ёсць у лабараторыі. Гэта тры 3D-прынтары, 3D-сканеры, лазерны гравёр і шэраг дадатковых прыкладных інструментаў з праграмным забеспячэннем для шліфавання, зборкі і іншых аперацый.

Прынтары дазваляюць ствараць суцэльныя трохмерныя аб'екты рознай геаметрычнай формы на аснове лічбавай мадэлі. 3D-сканаванне ажыццяўляе аўтаматычны збор і аналіз даддзеных патрэбнага аб'екта, яго формы, колеру і іншых характарыстык з наступным перайтварэннем у лічбавую трохмерную мадэль. Лазерны гравёр апрацоўвае гатовыя мадэлі і матэрыялы, наносіць выявы на паверхню і паляпшае канструкцыі аб'ектаў.

Дарэчы, на ММФ ужо вядуцца буйныя фундаментальныя і прыкладныя навуковыя працы па геамеханіцы, механіцы машын і мехатроніцы, якія патрабуюць выкарыстання 3D-прынтавання.

– Пакуль у БДУ ў працы FABLAB задзейнічана каля 10 студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў і выкладчыкаў, – кажа Сяргей Хвясеня. – Усе ахвотнікі могуць скарыстацца гэтымі тэхнічнымі рэсурсамі, каб рэалізаваць прыкладныя праекты ў рамках выканання курсавых, дыпломных, навуковых прац, навукова-тэхнічных даследаванняў.

Кансорцыум праекта

У агульнай праграме задзейнічаны навучальныя ўстановы некалькіх краін. Сярод іх: Фонд бізнес-інкубатараў Зеландыі (Данія), Універсітэт Валенсіі (Іспанія), Грэта дэ Велей (Францыя), Генцкі ўніверсітэт (Бельгія), Вышэйшая школа менеджменту (Партугалія), ІРАДЫЯРЭ (Партугалія), ІПСА Нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта Украіны «КПІ» (Украіна), Харкаўскі нацыянальны эканамічны ўніверсітэт (Украіна), Цярнопальскі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт (Украіна), Навукова-тэхналагічны парк БНТУ «Палітэхнік». А Новы ўніверсітэт Бакінгемпшыра (Вялікабрытанія) выступае ў ролі каардынатара праекта.

Пры выкананні першых крокаў праекта быў праведзены аналіз наяўнага досведу працы і кіравання фаблабамі ў ЕС і партнёрскіх краінах. Як дзеляцца кіраўнікі праекта, сумесна з назначанымі ўстановамі праводзіцца шэраг трэнінгаў, сустрэч і семінараў.

Характэрна тое, што на аснове навучальных трэнінгаў былі распрацаваны і знаходзяцца на ўзгадненні з каардынатарам навучальныя курсы па комплексе тэматык FABLAB: «Хуткае прататыпаванне і вытворчасць», «Тэорыя рашэння вынаходніцкіх задач», «3D-мадэляванне і праектаванне», «Кіраванне фаблаб-праектамі» і «Распаўсюджанне на рынку». Плануецца ўвесці іх у навучанне ў якасці спецкурсаў.

Якія вынікі чакаюцца?

У планах – праводзіць трэнінгі і майстар-класы для школьнікаў і студэнтаў, выйсці на шматсерыйную вытворчасць, узаемавыгадныя фінансавыя адносіны з заказчыкамі, партнёрамі-стартапамі. Папярэднія дамоўленасці ёсць, адзначае кіраўнік праекта.

– Удзел у дадзеным праекце спрыяе пашырэнню ведаў і кампетэнцый, якія ёсць у БДУ, па розных напрамках FABLAB, – лічыць Сяргей Хвясеня. – Гэта пераламленне ідэй і кампетэнцый выкладчыкаў і навучэнцаў у рэальныя бізнес-праекты. Яны могуць выйсці на прамысловыя ўзоры і вытворчасць поўнага цыкла.

– Праект завершыцца ў 2019 г. для Еўрапейскай камісіі і групы БДУ ў тым ліку. Далей – устойлівае развіццё, усё тое, што створана і напрацавана, павінна запусціцца і працаваць. А менавіта зацвярджэнне спецкурсаў, плана далейшай працы і выкананне шэрагу ўжо пазначаных праектаў у кантэксце FABLAB, – удакладняе Васіліна Раманенкава.

Кантакты

Усе навіны, публікацыі, анонсы і іншая карысная інфармацыя даступная на партале fablab-erasmus.eu і ў сацыяльнай сетцы Facebook: facebook.com/fablaberasmus.

Гутарыла
Алена ЛЯЎШЭНЯ

ВЕДАЙ НАШЫХ!

На фінішы – проста жывеш!

На прасторных праспектах Мінска 9 верасня стала цесна: упершыню больш за 35 тысяч чалавек прабеглі Мінскі паўмарафон. Сярод іх – кіраўнікі, супрацоўнікі і студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. І гэта больш за 1700 тых, хто называе БДУ сваёй alma mater.

Мінскі паўмарафон упершыню праводзіўся ў такім маштабе. У забегу стартавалі ўдзельнікі з 53 краін і 198 населеных пунктаў Беларусі і з 89 гарадоў Расіі. 1300 замежнікаў, з іх 600 – прадстаўнікі Расійскай Федэрацыі.

З прыгожым нумарам 28000 зборную каманду БДУ ўзначаліў рэктар **Андрэй КАРОЛЬ.** Выйшаў таксама на старт і прарэктар па эканоміцы і матэрыяльна-тэхнічным развіцці **Міхаіл ЧАРАПЕНІКАЎ** разам з сынам Раманам.

Сярод велізарнага натоўпу «нашых» знайсці было лёгка: сінія кепкі з эмблемай і надпісам «БДУ», яркія блакітныя майкі.

Асноўны склад зборнай прыняў удзел у самым масавым забегу на 5,5 кіламетраў. Але былі і тыя, хто скарыў і 10,5 і 21 кіламетр.

Гэта даказвае адно: БДУ аб'ядноўвае не толькі любоў да ведаў, але і спорт!

Напрыклад, знакаміты выпускнік–2015 **Ігар ХУДНІЦКІ,** стваральнік Business Intelligence Club, дзе для студэнтаў БДУ выступаюць паспяховыя бізнесмены, падзяліўся ўражлівымі вынікамі: «Сёлета я вырашыў не разменьвацца на дробязі. Як казала мая сяброўка Юля, навошта жадаць меншага, калі можна жадаць большага? Вось я і вырашыў прабегчы 21 км. Што з гэтага выйшла: за 3 месяцы 43 трэніроўкі, набегаў 308,75 км, спаліў 24655 ккал, бегаў у агульнай складанасці 32 г 36 мін 37 сек, заразіў яшчэ 5–6 чалавек бегам».

Больш за 30 нашых студэнтаў далучыліся да дабрачыннай акцыі падчас марафону ў падтрымку хворых дзяцей #геномбегом, якую арганізаваў часопіс «Імёны». Начальнік моладзевых праектаў УВРМ **Наталля ЯРАШЭВІЧ** падзялілася ўражаннямі: «Гэты забег для мяне пра Сям'ю. Пра праект «Сафія», пра сям'ю БДУ, пра сям'ю ў цэлым (дзеці, бацькі, бабулі, дзядулі). Гэта было прыемна і натхняльна! Атмасферу стваралі хары, аркестры, касцюмы, каманды з крычалкамі, канфеці, акцыі сацыяльнай падтрымкі, надвор'е і радасць кожнага ўдзельніка! Шчасце быць часткай кожнай сям'і і ўсяго паўмарафону. Выдатна, што мы прабеглі яго ў рамках забегу #геномбегом, шчаслівым і здаровым людзям быць!»

А ёсць і тыя студэнты, якіх не палічыць: многія рэгістраваліся загадзя і хадзілі на спецыяльныя трэніроўкі, каб падрыхтавацца да працяглых забегаў. Хтосьці не ведаў, што можна патрапіць у каманду БДУ, хтосьці бег са сваёй другой палавінкай з універсітэта ці заадно з сябрамі.

Студэнтка **Ірына ПЕТЫШ** прызнаецца, што раней не любіла бег: «Мяне заўсёды здзіўлялі і вельмі натхнялі людзі, якія жывуць бегам. Да іх мне пакуль далёка, але часам мне здаецца, што я іх у чымсьці разумею. У гэты раз, як і год назад, я адзін раз спынілася. І не прабегла 10 км, як абяцала, а зноў 5,5 км. Але я не засмучана і ніяк сябе не саромлю, таму што я зноў запісалася, ізноў прыйшла і зноў дабегла да фінішу. Са мной былі мае сябры, а на фінішы я ўбачыла маю сям'ю, для якіх я ўжо герой. Калі нарэшце перасякаеш фініш, у такі момант наогул ні пра што не думаеш, а проста жывеш. Адчуваеш свае ногі, рукі, як калоціцца сэрца, гарачыя шчокі, пульсацыю ў галаве. Востра чуеш натоўп, людзей вакол, увесь гэты струмень. І гэта настолькі зачароўвае, што, толькі фінішаваўшы, ты ўжо чакаеш наступнага старту».

Надзея МАРХЕЛЬ
Фота Васіля КУЗЬМІЧКІНА
і Таццяны БАГАМАЗАВАЙ

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

Падпісана да друку 21.09.2018 г.
Зак. 1025. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана на Дзяржаўным прадпрыемстве «БудМедыяПраект».
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014 220123, Мінск, вул. В. Харужай, 13/61.

Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 719, тэл. 259-70-77,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by